трезвость суждений с опорой на личный опыт. Выраженность отрицательного отношения уменьшается, положительные эмоции увеличиваются. В большинстве случаев дети относятся к лечению положительно. В ходе лечения они начинают понимать: чтобы справиться с болезнью, недостаточно быть сильным, терпеливым, мужественным, необходимы помощь врача, окружающего персонала и др. В целом клиника и все, что с ней связано, воспринимаются детьми как психотравмирующий фактор. Вместе с тем, несмотря на сложную стрессовую ситуацию, в которой они оказались, дети не ожесточаются, стараются мобилизовать свои силы. Они хотят верить врачам, которые их лечат, ждут помощи от персонала, который их окружает, и от своих родителей. Поэтому долг их всех – помочь детям в тяжелой для них ситуации, облегчить их состояние и поддержать надежду на выздоровление.

*А.І.Гурчанка*

## БЕЛАРУСКІ ФОЛК-РОК І ЯГО ЛІДЭР ГУРТ ЭТНАТРЫО “ТРОІЦА”

У апошнія гады ў Беларусі актыўна развіваецца эстрадны музычны стыль фолк-рок. Сярод ансамбляў, якія працуюць у гэтым кірунку, трэба адзначыць фолк-рок гурт “Палац”, этнарок-шоу “Юр’я” і “Крыві”. Асобнае месца займае даволі самабытны і арыгінальны калектыў “Троіца”, які за восем гадоў творчасці пакарыў замежных і айчынных слухачоў.

Этнатрыо “Троіца” (лідэр гурту – мультыінструменталіст Іван Кірчук) заснавана ў 1995 г. Ансамбль прымаў удзел амаль у 60 музычных фестывалях Беларусі, Расіі, Аўстрыі, Бельгіі, Венгрыі, Галандыі, Германіі, Босніі, Герцагавіны, Югаславіі, Польшчы, Харватыі, Славеніі, Партугаліі, Малайзіі, Сербіі і Эстоніі. Назва калектыву паходзіць ад шматзначнага і аб’ёмнага паняцця, адно з тлумачэнняў якога – траістая музыка (традыцыя ансамблевага музіцыравання ў Беларусі). Свой стыль калектыў пазначыў як folk-fusion (ф’южн – у пер. з англ. “сумесь”) – сінтэз аўтэнтычнага фальклору з сучаснымі музычнымі формамі (рок, блюз, джаз,

кантры, рок-н-рол і інш.). Музыканты заўсёды знаходзяцца на шляху пошуку і эксперыменту. Напрамак, у якім працуе калектыў, вызначаюць як world music (сусветная музыка) – сучаснае прачытанне народнай спадчыны з мінімальным змяненнем першакрыніцы.

Працуючы з моманту заснавання ў адным стылі, калектыў развіваецца, трансфармуе сваю творчую манеру. Так, другі склад гурту (І.Кірчук, Ю.Дзмітрыеў, Ю.Паўлоўскі) некалькі адрозніваецца ад першага (І.Кірчук, В.Шпілёнак, Д.Лук'янчык), які працаваў больш у фальклорным кірунку. Сённяшнія ўдзельнікі калектыву фарміраваліся пад уздзеяннем розных плыняў сучаснай музыкі: І.Кірчук – класікі рока і фальклору, Ю.Паўлоўскі – джаза і імправізацыі, Ю.Дзмітрыеў – рока і блюза ў сучасных яго варыянтах. Зразумела, што іх музыка стала стылістычна іншай. Сёння ў аранжыроўках можна заўважыць тэндэнцыю да ўвядзення элементаў іншых этнічных культур, у прыватнасці інтанацый, рытмічных малюнкаў, гармоній, не характэрных для беларускай музыкі. Значна ўзбагаціліся інструментарый, дыяпазон і тэмбравая палітра вакальных партый.

Аўтэнтыку гурт вывучае вельмі скрупулёзна, не толькі каб зрабіць аранжыроўку, але і дзеля захавання першакрыніцы, таму што экспедыцыйныя запісы знаходзяцца не на сучасных носьбітах, і існуе пагроза з цягам часу ўвогуле іх згубіць. Матэрыяламі для працы паслужылі ўласныя архівы экспедыцый І.Кірчука ў перыяд 1984–1996 гг. па рэгіёнах нашай краіны, архіў фоналабараторыі ІМЭФ НАН РБ, архіў Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь, а таксама прыватныя калекцыі. Калектыў распрацоўвае старажытныя песенныя пласты. Рэпертуар складае абрадавы (каляндарны, сямейны) і пазаабрадавы лірычны фальклор. Пераважная колькасць песень – жаночыя, таму што менавіта жанчыны прымалі непасрэдны ўдзел ва ўсіх абрадах, звязаных з вяселлем, нараджэннем і інш. Мужчынскіх жа песень зафіксавана значна менш.

Кожная песня падаецца ў тым ці іншым стылі ў залежнасці ад характару і складу першакрыніцы. Ансамбль не робіць акцэнт на музыцы, тэксце ці іншых сродках, а трактуе твор як нешта цэласнае, комплекснае, непадзельнае,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

захоўваючы мелодыку, рытміку, дыялект, нюансы, дыханне, манеру спеваў, тэкст.

У аснове працы калектыву заўсёды беларуская музыка, яе тэкст, арыгінальная мелодыя. Але, як сведчыць І.Кірчук, каб раскрыць дух першакрыніцы, неабходна мець гук, тэмбр належнага ўзроўню; неабходны настрой прыходзіць праз гучанне інструмента. Ансамбль актыўна і смела эксперыментуе са сваім інструментальным складам, выкарыстоўваючы нечаканыя інструменты, якія знаходзяцца ў калекцыі І.Кірчука. Гурт мае ўвесь комплекс беларускага традыцыйнага музычнага інструментарыя: жалейкі, дудкі, смык, домры, цымбалы, чарот, акарыны, ліру, званочкі. Разам з імі ўжываюцца галандскія і італьянскія акарыны, афрыканскія, індыйскія і балгарскія дудкі і жалейкі, галандскія званы і гонгі, нямецкія цытра і варган, турэцкія барабан і саз, рускія гуслі, афрыканскі барабан (джамба), какос з Зеландыі, бамбукавы ксілафон з Інданезіі, дарабука, анклуны, санза, дрэва дажджу, а таксама 6- і 12-струнная гітары. Такое нечаканае і даволі цікавае тэмбравае спалучэнне І.Кірчук аргументуе тым, што фальклорныя музычныя інструменты краін свету вырабляюцца з адных і тых жа матэрыялаў (дрэва, гліна і інш.) і маюць толькі нейкія тэмбравыя асаблівасці, таму гурт не абмяжоўвае сябе беларускім інструментарыем. У яго выкарыстанні музыканты адыходзяць ад саміх мелодый і гукаў; іх цікавіць не нацыянальнасць інструмента, а менавіта тэмбр. Аднак адчуваюцца і пэўныя этнічныя сувязі. Так, касу як музычны інструмент калектыў пачаў выкарыстоўваць тады, калі ўбачыў гэта ў праграме стараабрадцаў. Музыканты лічаць, што байкальскія стараабрадцы былі часткова выхадцамі з Беларусі і неслі на сваю другую радзіму культуру нашай краіны. У песні “Ой, бору мой” выкарыстаны гундаng, які для Беларусі ўвогуле не характэрны (разнавіднасць цытры: драўляная струна, нацягнутая на кавалак бамбуку). А на цытры гралі і ў нас, на радзіме. Так, разам з беларускімі народнымі інструментамі гурт свядома спалучае і традыцыйныя музычныя інструменты іншых краін.

Сцэнічны рух падчас выступлення этнатрыо амаль адсутнічае, калі не лічыць лазернае асвятленне, слайды і зме-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ну інструментаў на працягу ўсяго канцэрта. Музыканты шмат думалі наконт гэтага: планавалі выходзіць на сцэну па адным ці пакідаць сярод праграмы аднаго з музыкантаў для сольных нумароў. Аднак, па-першае, на сённяшнім этапе творчага развіцця калектыву гэта не патрэбна, таму што іх праграмы і без таго досыць самадастатковыя. А па-другое, рух на сцэне значна абмяжоўвае вялікая колькасць інструментаў і гукаўзмацняльнай апаратуры. Таму гэты кампанент сцэнічнага ўвасаблення музычнага фальклору для калектыву не з’яўляецца сродкам выразнасці.

Другаснае месца займае сцэнічны касцюм (калі не ўлічваць даволі арыгінальны і яркі сцэнічны вобліК І.Кірчука). Гурт шукаў розныя варыянты адзення. З цягам часу музыканты вырашылі, што да кожнай праграмы патрэбны новы яго варыянт, як у свой час рабілі “Песняры”. Улічваючы творчую ўстаноўку, калектыў адышоў ад народнага тыпу касцюма. Сцэнічны вобліК этнатрыо больш нагадвае язычніцкія матывы. Там нельга знайсці ніводнага выпадковага элемента – усё падпарадкавана агульнай эстэтычнай праграме і мае сваё тлумачэнне. Калектыў не робіць акцэнт на сцэнічным адзенні, бо лічыць, што гледача больш пераконвае наяўнасць на сцэне вялікай колькасці самых розных музычных інструментаў. У афармленні сцэны можна ўбачыць розныя аўтэнтычныя прадметы побыту (напрыклад, ручнікі). Досыць арыгінальным, на наш погляд, з’яўляецца выкарыстанне на канцэртах слайдаў з фотаздымкамі гурту падчас замежных гастрольных тураў, а таксама слайдаў з рознымі выявамі беларускіх народных музычных інструментаў, традыцыйнага адзення, прадметаў побыту.

Ансамбль мае некалькі альбомаў: “Троіца”, “Журавы” і сольны праект І.Кірчука “Спадчына загінуўшых вёсак”. У адносінах да апошняга музычны крытык З.Несцяровіч заўважае, што ў параўнанні з іншымі работамі гэтыя запісы “знаходзяцца значна бліжэй да аўтэнтычных узораў за кошт куды больш простага акампанементу, які максімальна набліжаны да народнага” [Мастацтва. – 2001. – № 4. – С. 50]. Альбом увогуле вырашаны ў камерным гучанні. Выкарыстаны шматлікія вакальныя і інструментальныя налажэнні. Трэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ба адзначыць, што І.Кірчук па-майстэрску валодае як дыяпазонам і тэмбравай палітрай свайго голасу, так і магчымасцямі вялікай колькасці музычных інструментаў (на канцэрце ўвесь час ідзе іх змена). А ёсць кампазіцыі, дзе таленавіты музыкант адначасова спявае і іграе на варгане, што сёння ў традыцыйным народным інструментальным выканаўстве не выкарыстоўваецца.

Такім чынам, працуючы на высокамастацкім, еўрапейскім узроўні, гурт шырока прапагандуе беларускае мастацтва далёка за мяжой і адраджае старадаўнія культурныя традыцыі. Больш таго, яго творчасць выконвае і такую вельмі значную выхаваўчую функцыю, як фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці і музычнага густу шырокага кола моладзі, якая складае асноўную слухацкую аўдыторыю.

*А.М.Дзедавец*

## АКТЫВІЗАЦЫЯ ТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ДЗІЦЯЧАГА МУЗЫЧНАГА ФАЛЬКЛОРУ

Актывізацыя творчай дзейнасці – адзін з галоўных напрамкаў развіцця асобы, менавіта яна дае чалавеку магчымасць праявіць індывідуальнасць і унікальнасць у адносінах да таго, што існуе вакол нас. Зараз у адукацыі адчуваецца супярэчнасць паміж неабходнасцю павышэння творчай актыўнасці кожнага вучня і існуючай практыкай арганізацыі вучэбнай дзейнасці, якая арыентуецца на рэпрадуктыўнае навучанне. У такіх абставінах погляды многіх педагогаў звяртаюцца ў бок музычнага фальклору. Фальклор усё больш усведамляецца грамадствам як самабытны фактар духоўнасці, далучэння да нацыянальнай культуры і гісторыі народа, а развіццю падрастаючага пакалення з дапамогай фальклору надаецца значная ўвага.

“Кожнае дзіця з першых месяцаў жыцця сутыкаецца з калыханкамі, забаўлянкамі, прыгаворкамі, казкамі, а затым, падрастаючы, – з лічылкамі, дражнілкамі, заклічкамі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ